Геніяльная празорлівасць, здольнасць быстра схватваць і разгадваць унутраны сэнс насоўваючыхся падзей—гэта тое самае свойства Леніна, якое дапамагала яму намячаць правільную стратэгію і ясную лінію паводзення на паваротах рэволюцыйнага руху.

(«Правда» № 34, 1924 г.)

САПРАУДНЫЯ ГАСПАДАРЫ ЗЯМЛІ

У Беластоцкім павеце памешчыкам належала 36.471 гектар самай лепшай зямлі, у тым ліку: пахатнай 5.426 гектараў, сенажацей 3.037 гектараў, выпасаў—690 гектараў, — у той час, як сотні сялянскіх гаспадарак і батракоў зусім не мелі зямлі. Ім прыходзілася ад цямна да цямна працаваць на памешчыкаў за кавалак хлеба. Зараз памешчыцкая зямля перайшла ў рукі батракоў, беззямельных і малазямельных сялян. Зямлю атрымалі сапраўдныя гаспадары.

474 батрацкіх сямей атрымалі 2.145 гектараў пахатнай зямлі і сенажацей. 710 беззямельных сялян атрымалі 1.454 гектары зямлі, сярод 2297 малазямельных гаспадарак раздзелена 3.900 гектараў.

Так, да раздзела памешчыцкіх зямель па Беластоцкаму павету налічвалася 1.133 беззямельных гаспадаркі. Гаспадарак, якія мелі зямлі да 2-х гектараў, было 1.072, ад 2 да 5 гектараў, — 971 гаспадарка, ад 5 да 10 гектараў — 257 гаспадарак, ад 10 да 15 гектараў—27 гаспадарак, ад 15 да 20 гектараў—10 гаспадарак, ад 20 да 25 гектараў — 3 гаспадаркі 13 гаспадаркі мелі больш за 25 гектараў.

Пасля раздзелу былыя беззямельныя гаспадаркі маюць зямлю. Гаспадарак, якія маюць да 2-х гектараў зямлі, стала 736, ад 2 да 5 гектараў — 1.679 гаспадарак, ад 5 да 10 гектараў — 928 гаспадарак, ад 10 да 15 гектараў — 74 гаспадаркі, ад 15 да 20 гектараў — 20 гаспадарак, ад 20 да 25 гектараў — 3 гаспадаркі, гаспадарак, меўшых больш 25 гектараў, у павеце ўжо больш няма.

Зараз па былых маёнтках праводзіцца абмалот зернавых культур. Усё насенне ссыпаецца ў свірны. Гэта насенне будзе выдавацца ў першую чаргу батракам і сялянам, якія атрымалі зямлю і не маюць свайго насення.

Па-новаму жывуць зараз батракі. Многім сем'ям батракоў прадастаўлены кватэры ў былых памешчыцкіх дамах. Цяпер батракі цвёрда ўпэўнены, што ім не прыдзецца сядзець без хлеба, бо ў іх ёсць зямля.

С. Саліт,
старшы аграном Беластоцкага павятовага земаддзела,

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ

Ва ўсіх былых маёнтках Сакольскага павета закончана малацьба зернавых культур. Абмалочанае зярно ссыпана ў свірны і зараз арганізавана ачыстка яго. Усяго намалочана насення: пшаніцы яравой — 62 цэнтнеры, пшаніцы азімай — 220 цэнтнераў, аўса — 390 цэнт.

Зараз у сувязі з падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі ў валасцях павета арганізаваны 12 зернаачышчальных пунктаў. На кожным пункце ў дастатковай колькасці ёсць машыны для ачысткі насення — трыеры, сартыроўкі і інш.

У павеце таксама арганізавана 4 пракатных пункты. Такія пункты арганізаваны ў Буталаве, Кольным, Віленшчызне і Князёўцы.

Т. М.

—«о»—

КАГО МЫ ПРЫМАЕМ У РАДЫ КОМСАМОЛА

На адбыўшымся 13 студзеня пасяджэнні бюро Гродненскага павятовага камітэта комсамола разглядаліся заявы аб прыёме ў рады ленінска-сталінскага комсамола: тт. Васіля Лашака, Алексея Смолка і Фрыдман.


Сын малазямельнага селяніна, Васіль Лашак пачаў сваю падпольную рэвалюцыйную работу яшчэ будучы юнаком. Яго ў 1937 годзе жандары кідаюць у турму. Чырвоная Армія вызваляе Лашака з няволі. Ён актыўна ўключаецца ў барацьбу з белапольскімі бандамі, разам з Чырвонай Арміяй знішчае іх. Народ, як свайго лепшага сына, адданага справе працоўных, абірае яго дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Польскія ўлады арыштавалі Смолка, калі яму было 18 год. Яго бязлітасна збівалі жандары, здзекваліся над ім, патрабавалі прызнання ў прыналежнасці да большэвікоў. Пасля выхаду з турмы Смолка зноў энергічна бярэцца за рэвалюцыйную работу. І як толькі ён даведаўся аб пераходзе граніцы Чырвонай Арміяй, арганізоўвае атрад, які разбройвае паліцыю і банды асаднікаў. Сяляне абіраюць яго членам валаснога камітэта, а пасля — старшынёй сялянскага камітэта вёскі Цэлева.

Цяжкі шлях жыцця і ў Фрыдман, якая гадамі была беспрацоўнай.

Усе яны атрымалі пачэснае званне членаў ленінскага комсамола.

Маўрын,
сакратар Гродненскага укома комсамола.



На снимке: работница гос. фанерного завода в г. Белостоке тов. Маляк М. за работой у станка. (Фото Сапир).

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

„САЛОДЗЕНЬКІ“

З прыходам на тэрыторыю Заходняй Беларусі гераічнай Чырвонай Арміі, а з ёй і совецкай улады, сёй той перафарбаваў свой фасад, апрануў на сябе авечую скуру, прыняў выгляд „смірэнага“, „салодзенькага“ прыяцеля совецкай улады, каб спадцішка пры зручным выпадку прымяніць свае воўчыя зубы.

Такога тыпа мы сустрэлі на бацькоўскім сходзе ў 1-й школе.

...Невялічкага росту, прылізаны, лысы, ён сядзеў у прэзідыуме схода. Ён не мог дачакацца канца даклада. Яму хацелася гаварыць. І вось, нарэшце, тоненькім, ільслівым голасам ён просіць слова.

— Таварыш загадчык! Дазвольце мне ад свайго імя і ад імя ўсіх прысутных віншаваць у вашай асобе совецкую ўладу, як я ёсць сам бедны чалавек. Вы вельмі разумна гаварылі. Я з задавальненнем слухаў вашы мудрыя словы...

І паліліся на цэлую поўгадзіну патокі бруднай ільслівай патакі.

Ён не забывае і прысутных, стараючыся гаварыць ад імя „вобчаства“.

— Панове! Вы даруйце мне, што я гавару па-руску, я выдатна валодаю польскай мовай, але з пашаны да таварыша загадчыка, гавару па-руску.

Ён імкнецца гаварыць як артыст, з жэстыкуляцыяй і мімікай.

— Совецкая сістэма ў школе! О! Гэта выдатна! Гэта цудоўна! Але... (Тут у прамоўцы стала пяршыць у горле).

Ён адкашляўся і пачаў у наступным стылі:

— Але я звяртаю вашу ўвагу, таварыш загадчык, на адну дробязь — на маленькую, кволую душоначку дзіцяці. 7 год мой сын выхоўваўся ў польскай школе, у польскім духу. Ён выдатна займаецца, ён занадта начытан, ён занадта разумны. Хіба можна дзейнічаць на псіхіку дзіцяці? Хіба можна дзейнічаць на яго душонку? Я прашу, ці нельга адкласці совецкую сістэму да восені? Зараз зіма, мароз... Хай усё застаецца па-старому. Толькі да восені. (Відаць, у надзеі на перамены не толькі на двор'я...). І тады... (Тут прамоўца ўвайшоў у экстаз, голас яго зазвінеў). І тады гэтай няшчаснай маці (прамоўца паказаў на жанчыну ў шубе і фасоністай шляпе) не трэба будзе траціць 8 рублёў на новыя падручнікі, тады дзецям не трэба будзе ўставаць к 9 гадзінам па маскоўскаму часу, і тады, душонка дзіцяці, яго псіхіка, яго дастоінствы застануцца ранейшымі; і тады... (прамоўца спыніўся, відаць, чакаючы апладысментаў, але, не дачакаўшыся, сеў).

Пасля яго гаварылі другія. З іх прамоў, між іншым, можна было зрабіць вывад і аб нашым прамоўцу:

— Пан Осетынскі. Дрэнна схаваў ты свае зубы. Яны тырчаць.

Т. Лясовіч.

ХУДОЖЕСТВЕННАЯ САМОДЕЯТЕЛЬНОСТЬ

„Капитализм душил, подавлял, разбивал массу талантов среди рабочих и трудящихся крестьян. Таланты эти гибли под гнетом нужды, нищеты, надругательств над человеческой личностью“. (Ленин).

Октябрьская революция создала возможности для роста социалистической культуры, культуры связанной неразрывно с народом и черпающей свои животворные соки из широких трудящихся масс. В то время, когда в постоянной борьбе за хлеб проходила жизнь многонационального пролетариата в панской Польше, трудящиеся Советского Союза, сбросив оковы эксплоатации, развивали свои творческие силы, строили социалистическую культуру.

С приходом Красной Армии в Белосток на фабриках и заводах жизнь потекла по новому. Трудящиеся услышали о больших рабочих театрах, они увидели на белостокской сцене художественные ансамбли рабочих и крестьян.

На фабриках и заводах города, в селах и деревнях области забила ключем жизнь. Трудящиеся стремятся к культурной и творческой жизни. Создаются сотни кружков художественной самодеятельности. В самом Белостоке насчитывается уже свыше 100 хоровых, музыкальных, драматических, танцовальных и других кружков.

Текстильный комбинат № 2 создал еще в ноябре месяце большой рабочий хор в составе 50 человек. Хор под художественным руководством инструктора Дома народного творчества тов. Кучакевича, исполняет народные песни, а в последнее время и песни советских композиторов — „Счастливая земля“, „Молодость“ и др. Кроме хора работает на фабрике драматический и танцовальный кружки, которые пользуются большим успехом среди рабочих. Особенно пользуется популярностью танцовальный кружок под руководством награжденной на международном конкурсе танцев в Брюсселе— балерины Свен. На организованном для 2 и 3 текстильных комбинатов новогоднем вечере все три кружка демонстрировали свои первые творческие успехи.

Пример рабочих 2 комбината скоро подхватили другие фабрики. Хорошо работает драматический и хоровой кружки при 3 текстильном комбинате. В них участвует около 50 человек.

Кружки художественной самодеятельности есть почти на каждой фабрике. Некоторые из них готовятся к постановке пьес. На 18-ой текстильной фабрике с половины декабря работает в драматическом кружке около 20 рабочих. Они готовят пьесу своего художественного руководителя тов. Мяцкуна „Дело 147“.

Некоторые фабрики уже имеют духовые оркестры: фанерный завод, стекольный завод, 1 текстильный комбинат, кожевенный завод бывш. владельца Бекера, клуб железнодорожников.

В городе работает большой самодеятельный хор рабочих и служащих, состоящий из 200 человек. Хор готовится к участию в декаде белорусского искусства в Москве.

Отдельно ведется работа по линии изобразительного искусства. В городе организуются изокружки. В деревнях Волковыского уезда — Сидорках, Задворянцах, Михайлах, местные фольклористы собрали и записали на ноты 43 народных песни, 18 народных танцев, 2 народные сказки. В трех деревнях Бельского уезда собиратели фольклора записали около 40 народных песен.

Все шире развертывается художественная самодеятельность на фабриках и заводах. Однако, большим препятствием в работе является то, что иногда участники одного кружка работают в разных сменах.

Эти вопросы могут быть решены только с помощью фабричного комитета и администрации фабрики. И действительно там, где фабком и директор фабрики хорошо поняли значение художественной самодеятельности рабочих, видны большие результаты. Например, идя навстречу желаниям участников драмкружка, директор 13 текстильной фабрики прикрепил всех кружковцев к одной смене. Это явилось большой помощью для кружка.

Некоторые фабкомы и директора не поняли или недооценивают значение художественной самодеятельности рабочих. Они не оказывают им конкретной помощи, остаются пассивными свидетелями. Руководители предприятий должны помнить, что развитие художественной самодеятельности является одним из самых важных и актуальных вопросов подъема культуры трудящихся.

Л. Рудин.

УЗНАЧАЛІЦЬ ПАЛІТЫЧНУЮ АКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ

У жыцці працоўнай моладзі заходніх абласцей БССР зараз адбываюцца вялікія, хвалюючыя падзеі: Совецкая ўлада дала моладзі правы грамадзян СССР.

У перыяд выбараў дэпутатаў Народнага Сабрання Заходняй Беларусі з ліку рабочай і сялянскай моладзі вылучылася нямала таленавітых арганізатараў. Маладыя рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя ішлі ў Чырвоную гвардыю, працавалі ў часовых упраўленнях і сялянскіх камітэтах, былі членамі акруговых і ўчастковых выбарчых камісій і агітатарамі.

Павятовыя камітэты комсамола і пярвічныя арганізацыі арганізуюць моладзь, узначальваюць яе актыўнасць. Ва ўсіх гарадах і паветах па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі праведзены 10-дзённыя курсы агітатараў. Многія з іх ўжо работаюць загадчыкамі дамоў соцкультуры, хат-чытален, чырвоных куткоў, чытчыкамі і арганізатарамі культурна-масавай работы.

Пры актыўным удзеле комсамольцаў у вобласці, галоўным чынам у вёсцы, адкрыта 35 клубаў, 95 хат-чытален, 150 чырвоных куткоў. У Індурскую воласць арганізатарам комсамольскай работы быў накіраван комсамолец Меркулаў. Пры яго ўдзеле моладзь гэтай воласці арганізавала хату-чытальню. Загадчыкам хаты-чытальні працуе мясцовы актывіст тав. Ліпман. Хата-чытальня стала цэнтрам усёй масава-палітычнай работы ў гэтай воласці. Тут ёсць бібліятэка, газеты, настолныя ігры, пакой для работы гурткоў. Пры чытальні працуюць гурткі палітграматы па вывучэнню статута і праграмы ВЛКСМ, драматычны, харавы, арганізаван духавы аркестр. Штодня хату-чытальню наведвае больш 200 чалавек, а ў часы правядзення гутарак, або лекцый, ці выступленняў калектыва самадзейнасці зала перапоўнена. Гуртоўцы з'явіліся арганізатарамі чырвонага абоза з хлебам. Сяляне прадалі дзяржаве 38 тон зярна.

У вобласці працуе зараз 291 гурток палітграматы, з іх 62 ў гарадах і 229 у вёсках. У гэтых гуртках моладзь вывучае Канстытуцыю СССР і БССР, пытанні міжнароднага і ўнутранага становішча СССР і т. п. Акрамя таго створаны 167 гурткоў па вывучэнню статута і праграмы ВЛКСМ. Сіламі комсамольцаў праведзены многалюдныя сходы рабочай і сялянскай моладзі.

З вялікай ахвотай ідзе моладзь у гурткі самадзейнасці. У вобласці ўжо арганізавана 224 самадзейных калектывы. 5.049 чалавек займаюцца ў драматычных, харавых і балетных гуртках. Сярод іх многа таленавітых выканаўцаў. У Гродненскім павеце, па валасцях, ужо праходзіць агляд мастацкай самадзейнасці. Для прэміравання лепшых калектываў і выканаўцаў павятовы выканаўчы камітэт выдзеліў 19.000 руб. Такія-ж агляды мастацкай самадзейнасці праходзяць і па другіх паветах. У красавіку месяцы будзе праведзена абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці.

Устанаўленне совецкай улады натхняе моладзь на гераічныя справы ў славу сваёй радзімы. На прадпрыемствах шырыцца хваля соцыялістычнага спаборніцтва. Па-новаму адносіцца моладзь да работы, да абсталявання фабрык і заводаў, да народнай соцыялістычнай маёмасці.

У непрыглядным стане знаходзілася абсталяванне на нацыяналізаванай суконнай фабрыцы № 14. Моладзь гэтай фабрыкі на сваёй ініцыятыве правяла суботнік. Маладыя ткачы ачысцілі ад гразі і адрамантавалі варштаты, прыбралі ў парадак тэрыторыю фабрыкі.

З кожным днём на фабрыцы расце вытворчасць працы, значна палепшылася якасць сукна. Штодзённа на 170—200 процантаў выконвае сваю норму малады ткач Майсей Фін. На фабрыцы арганізавана маладзёжная брыгада. Яе ўзначальвае малады ткач, старшыня фабрычнага камітэта Стасевіч. Брыгада з'явілася ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва за перавыкананне плана і высокую якасць прадукцыі. Высокую вытварчасць паказваюць маладзёжныя брыгады на тэкстыльным камбінаце № 1. 6 маладых ткачоў камбіната ўжо перайшлі на абслугоўванне двух станкоў.

Значных поспехаў дабіліся маладыя чыгуначнікі. Раней, у панскай Польшчы, моладзь і жанчыны на чыгунку не прымаліся. Таму паяўленне на чыгунцы маладых совецкіх юнакоў і дзяўчат машыністамі паравозаў, дыспетчарамі, дзяжурнымі па станцыі, начальнікамі служб і г. д. сустрэта мясцовым насельніцтвам са здзіўленнем. Зараз для моладзі і жанчын заходніх абласцей БССР адкрыт доступ на чыгунку.

Ініцыятарамі соцыялістычнага спаборніцтва на Беластоцкай чыгунцы з'явіліся маладыя чыгуначнікі Валкавыскага вузла. Комсамольцы чыгуначнікі высока трымаюць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва. Адным з лепшых паравозаў у Беластоку з'яўляецца паравоз машыніста комсамольца Алексея Хлапцова. У той час, калі другія паравозы следуюць са скорасцю 20—25 кілометраў, сярэдняя скорасць комсамольскага паравоза дасягнула 40 кілометраў. Тов. Хлапцоў зараз рыхтуецца вадзіць паязды цяжкай вагі. У дэпо асабліва высокую вытварчасць працы паказваюць маладыя токары Папугаеў Алексей і Бертова Ольга.

На чыгунцы пачала работу першая маладзёжная жаночая брыгада. Узначальвае яе былая беспрацоўная, маладая дзяўчына Савіцкая. Зараз ідзе падрыхтоўка да стварэння на чыгунцы адзінай комсамольскай змены, якую будзе ўзначальваць старшы дзяжурны па чыгунцы — комсамолец Звераў.

З вялікім уздымам моладзь гарадоў і вёсак сустрэла рашэнне ЦК ЛКСМБ аб стварэнні комсамольскіх арганізацый у заходніх абласцях. Ужо зараз падана да 650 заяў перадавой рабочай і сялянскай моладзі аб прыёме яе ў рады ЛКСМ.

Было-б няправільна не гаварыць аб слабых баках нашай работы. Прайшоўшыя павятовыя і гарадскія сходы комсамольцаў ускрылі сур'ёзныя недахопы ў нашай рабоце. Галоўны з іх — недастатковая ўвага некаторых арганізацый да вытворчых пытанняў, да гаспадарчай дзейнасці. Напрыклад, Гродненскі гарком комсамола да апошніх дзён мала цікавіўся тым, як арганізавана праца на нацыяналізаваных прадпрыемствах, не ўзначаліў соцыялістычнага спаборніцтва.

Не заняліся мы сур'ёзна арганізацыяй абаронна-фізкультурнай работы. Недастаткова мы ўнікаем у работу школ.

Нельга не адзначыць, што актывізацыя буржуазна-нацыяналістычных і другіх варожых маладзёжных арганізацый былой панскай Польшчы, схаваўшыхся ў падполле, патрабуе ад нас яшчэ большага ўзмацнення агітацыйна-прапагандысцкай работы, накіраванай на выкрыццё здрадніцкай ролі гэтых арганізацый і іх контррэволюцыйнай сутнасці.

Праводзячы гэтыя мерапрыемствы вялікай палітычнай важнасці, мы з упэўненасцю можам заявіць, што пад кіраўніцтвам вялікай партыі большэвікоў пастаўленыя перад комсамолам і моладдзю вобласці адказныя задачы будуць выкананы з чэсцю.

В. Е. Печурэнка,
сакратар Беластоцкага абкома ЛКСМБ.

В ВОСТОЧНОЙ ФИНЛЯНДИИ

В многочисленных финских деревнях, освобожденных Красной Армией и Народной Армией от белофиннов, проводится большая созидательная работа по восстановлению нормальной жизни. В Суоярви прибыл с передовых позиций и из поездки по населенным пунктам Восточной Финляндии член Народного правительства Финляндской Демократической Республики, министр по делам Карелии господин Пааво Прокконен. В беседе с нашим корреспондентом г-н Прокконен рассказал следующее:

— Народное правительство Финляндии опирается на широкий народный фронт. В населенных пунктах, в которые возвращаются жители, создаются комитеты трудового народного фронта. Население выбирает в комитеты в подавляющем большинстве рабочих, крестьян, бедняков и середняков.

В деревне Майсинваара сейчас 280 жителей, из них 60 человек, угнанных офицерьем перед наступлением Красной Армии, на днях вернулись в родные места.

Незадолго до вступления Красной Армии шюцкоровцы, члены организации „Лотта Свэрд", офицеры, убеждали народ, что с приходом Красной Армии женщин будут ссылать в Сибирь, мужчин расстреливать, а деревня будет сожжена „красными комиссарами". На самом же деле деревни сжигались самими шюцкоровцами. Население видело, как офицерье поджигало дома, воздвигнутые ценой пота и крови бедняков. Когда же пришли красноармейцы, они сразу рассеяли все сомнения крестьян и своим корректным, товарищеским поведением завоевали глубокую любовь народа.

Недавно в Майсинваара произошел следующий случай. В деревне появились три белофинна. Комитет трудового народного фронта послал 16-летнего мальчика Юрье Макконена сообщить об этом в соседнюю деревню, где находились красноармейцы. Мальчик тотчас же исполнил поручение, и трое бандитов были задержаны.

До прихода освободительницы — Красной Армии финские крестьяне несли огромные тяготы непомерно больших налогов. В Майсинваара бедняк Симо Макконен был обложен таким налогом, который он никак не мог заплатить. Тогда власти продали весь его скарб и посевы, но потом, увидев страшную картину разорения, сделали „благотворительный" жест: обязали Макконена выплачивать налог в течение 40 лет. Народное правительство освободило Симо Макконена от подобных долгов.

Комитеты трудового народного фронта раз'ясняют населению сущность договора, заключенного Народным правительством Финляндии с правительством Советского Союза, декларацию Народного правительства и берут на учет и под охрану помещичьи владения. Бедняки и середняки обязуются ухаживать за скотом, брошенным помещиками.

Всюду в населенных пунктах Восточной Финляндии развернута торговля. В магазинах продаются все предметы первой необходимости. Жители удивлены обилием товаров. Их поражает, что они могут свободно и в любом количестве покупать сахар. Ведь до прихода Красной Армии сахар продавался здесь по карточкам, а за последние 8 месяцев его в магазинах не было совершенно.

У населения, доведенного правительством Каяндера до обнищания, низка покупательная способность. Народное правительство разрешило для бедняков и семей резервистов, попавших в тяжелое положение, отпускать товар в кредит.

В деревни, из которых силой оружия шюцкоровцы при отступлении угнали народ, каждый день возвращаются все новые и новые люди. Они бегут через леса и болота из так называемых „эвакуаций" в свои родные села и деревни. 30 ноября, когда в деревню Хаутавара вошли части Красной Армии, во всей деревне было только 8 человек. Сейчас уже вернулось 60 человек. В деревне развернута торговля, готовится к открытию школа, которая не работала больше полугода.

В деревне Каркку комитет привел в порядок школу, достал учебные пособия, позаботился об учителе. Школьные занятия возобновятся в ближайшие дни.

— Сейчас в Восточной Финляндии, — сказал в заключение беседы министр Прокконен,—работают 35 представителей Народного правительства. Они опираются в своей работе на народ, который любит и безгранично верит своему родному правительству, Народной Армии и дружественной Красной Армии нашего могучего соседа-друга.

СУОЯРВИ. (Восточная Финляндия). (Спец. корр. Комс. Правды).

Трудящиеся Англии протестуют против помощи бело-Финляндии

ЛОНДОН, 12 января. Движение против помощи маннергеймовским бандам принимает в Англии все более широкие размеры. Окружной совет профсоюзов Ньюкастла принял резолюцию, в которой он протестует против посылки оружия в бело-Финляндию и требует, чтобы конгресс Тред-Юнионов принял против этого необходимые меры.

Действия английского правительства, оказывающего помощь бело-Финляндии, осуждаются также в резолюции, принятой районным комитетом об'единенного профсоюза машиностроительных рабочих в Глостере (главный город одноименного графства). В резолюции говорится, что исполком об'единенного профсоюза машиностроительных рабочих должен принять все зависящие от него меры, чтобы не допускать догрузки вооружений на пароходы для бело-Финляндии. Одно из крупнейших в Лондоне отделений профсоюза муниципальных рабочих в Вестэнде приняло резолюцию, в которой оно поручает своим представителям на заседании лондонского совета профсоюзов 13 января требовать принятия мер против оказания помощи палачу Маннергейму.

Резолюции, осуждающие поддержку белофиннам, приняты также одним из лондонских отделений национального профсоюза служащих.

„Дейли уоркер" опубликовала заявление известного ирландского драматурга О'Кеси, в котором он осуждает помощь бело-Финляндии и выражает уверенность в скорой победе финляндского народа над маннергеймовщиной.

Как в Швеции создается фонд „помощи" бело-Финляндии

СТОКГОЛЬМ, 13 января. В Швеции проводится систематический сбор средств для бело-Финляндии. О том, как собираются эти деньги, сообщает шведская буржуазная печать. Так, организованный в декабре прошлого года в Швеции полуправительственный сельскохозяйственный союз разослал всем крестьянам-членам союза директиву, в которой требует пожертвования в пользу белофинского правительства однодневной выручки от продажи и 100 килограммов зерна. В случае отказа уплатить эти средства в пользу бело-финнов, крестьяне подвергаются риску быть выброшенными из союза. Так шведские власти принуждают население помогать маннергеймовцам.


НА ЗАПАДНОМ ФРОНТЕ

ПАРИЖ, 13 января. Сообщается, что вчера днем на фронте наблюдалась местная деятельность разведывательных частей. Ночью не произошло ничего важного.

ЛОНДОН, 12 января. Министерство авиации опубликовало список погибших летчиков, который содержит 78 фамилий.

(ТАСС).

В МЕЖДУНАРОДНОЙ ГОСТИНИЦЕ.



Мосье паны, вам придется потесниться, мы ждем новых жильцов из Финляндии. (Фото-клише ТАСС).

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

РЫБНОЕ ХОЗЯЙСТВО В АВГУСТОВЕ

Августовский уезд располагает множеством водных бассейнов, озер, речек и прудов. Все это способствует развитию рыбного хозяйства. В искусственных и естественных прудах и речках водятся все виды рыб: щуки, лещи, язи, плотва, окуни, карпы и т. д.

Рыбное хозяйство, как и все отрасли хозяйственной жизни б. Польши, было заброшенным участком. После установления советской власти в Августове создано рыбно-промышленное хозяйство, которым руководит опытный рыбак тов. Шигель.

В 1940 г. рыбное хозяйство будет расширено: предполагается создать в Августовском уезде новые искусственные пруды на территории 100 гектаров. В Августове уже работает рыбная артель, которая за период от 29 сентября до конца 1939 г. выловила 53.694 клг. разной рыбы.

Члены артели успешно борются за образцовую постановку работы по улову рыбы.

—о—

ЛАБОРАТОРИЯ ДЛЯ ПРОВЕРКИ ЛЕКАРСТВ И МЕДИКАМЕНТОВ

Белостокское Областное отделение главного аптечного управления Наркомздрава БССР на - днях открывает в г. Белостоке аналитическую лабораторию для проверки качества лекарств, изготовляемых в аптеках.

Новая лаборатория будет также проверять качество всех медикаментов, поступающих в аптечные базы и склады.

ТРЭСТ САДАВОДСТВА І ГАРОДНІЦТВА

Па Аўгустоўскаму павету налічваецца 149 гектараў садоў з колькасцю 9189 штук фруктовых дрэў. Маецца таксама пітомнік фруктовых дрэў плошчай у 1,83 гектара, у якім налічваецца 8.150 сажанцаў.

У павеце створан трэст садоўніцтва і гародніцтва. Усе сады былых маёнткаў і пітомнік перададзены трэсту.

—о—

ПАПАЎНЕННЕ БІБЛІЯТЭКІ НОВЫМІ КНІГАМІ

За прайшоўшы час спачатку 1940 года Аўгустоўская гарадская бібліятэка закупіла на 2.000 рублёў рад новых кніг на яўрэйскай, польскай і рускай мовах. Сярод купленых кніг творы Якуба Коласа,, Шолам-Алейхема, Пераца, Маркіша, Змітрака Бядулі.

Гарадская бібліятэка разаслала ў валасныя цэнтры павета кніг на 7.000 рублёў.

За апошні час значна вырас лік чытачоў бібліятэкі. Зараз бібліятэка налічвае 900 чытачоў.

—о—

СНАБЖЕНИЕ ТЕКСТИЛЬНОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ

Для снабжения белостокских текстильных предприятий отгружено из Москвы за последние дни около 60 тонн шерсти. Сейчас отгружается еще 200 тонн.

Отгружаются также в большом количество хлопчато-бумажная пряжа, краски и разные химикаты.

—«»—

ПЕРВОЕ ЗАСЕДАНИЕ БЕЛОСТОКСКОГО ОБЛАСТНОГО СУДА

13 января состоялось в Белостоке первое открытое заседание областного суда. Председательствовал член областного суда тов. М. У. Лобач при участии заседателей тт. Павловой и Вапник.

Суд разбирал дело гр. гр. Киричука А. и Грабовской М., обвиняемых в том, что в ночь с 26 на 27 ноября они совершили в Белостоке кражу со взломом в кустарной мастерской гр. Епак. Преступники украли одежду, кожу и т.п.

Как показало судебное следствие Киричук является вором профессионалом. Грабовская, его сожительница имеет всего 21 год; она сейчас беременна. Преступники сознались в совершенном преступлении.

Обвинитель, помощник городского прокурора, тов. Бенинсон в своей речи подчеркнула, что преступление, а особенно кража-является непосредственным продуктом буржуазного строя. Бывшее польское государство не могло обеспечить рабочих и крестьян работой и это толкало людей на преступный путь. Но обвиняемые свое преступление совершили уже при советской власти. Подсудимые, сказала тов. Бенинсон, не искали работы, они не обратились в соответствующие советские организации с просьбой устройства их на какую-нибудь работу. Они избрали путь преступления и поэтому должны сейчас понести соответствующее наказание.

Защитник обвиняемой Грабовской, являющейся дочерью крестьянина-бедняка, никогда не судимой, имеющей всего 21 год од роду, сейчас беременной, тов. Аркин просил суд применить к подсудимой условное наказание. Он подчеркнул, что Грабовская является жертвой капиталистического общества. Но, к счастью обвиняемой, ее сейчас судит советский суд, который должен ей протянуть руку помощи. Защитник Киричука тов. Вайцман просил не принимать во внимание судебных приговоров капиталистических судов (Киричук был много раз судим за кражи) и применить к подсудимому условное наказание.

Белостокский областной суд не нашел никаких смягчающих обстоятельств по отношению к подсудимому Киричуку, признал его профессиональным вором и приговорил к двум годам принудительных работ.

Грабовскую суд приговорил условно к лишению свободы на полтора года с испытательным сроком на три года.

Бемов

Адказны рэдактар Б. М. Зельманаў

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара— 45; партаддзела і сакратарыята —47; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17.62; выдавецтва і аддзел аб'яў—35; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.

Упаўнаважаны абл. літа № К—3.